# Беларускі ўніверсітэт

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 26 (268) | 8 кастрычніка 1956 года | Цана 20 кап.


# ПАЛЕПШЫЦЬ ПАДРЫХТОЎКУ НАВУКОВЫХ КАДРАЎ

(З пасяджэння Вучонага совета БДУ)

28 верасня Вучоны совет універсітэта заслухаў і абмеркаваў даклад прарэктара па навуковай рабоце Г. А. Павецьева «Аб мерах па паляпшэнню падрыхтоўкі і атэстацыі навуковых і педагагічных кадраў».

У сваім дакладзе Г. А. Павецьеў выклаў Пастанову ЦК КПСС і Совета Міністраў СССР, накіраваную на паляпшэнне навуковых кадраў. Пастанова падкэслівае вядомыя поспехі ў падрыхтоўцы навуковых і педагагічных кадраў, якія дастаткова кваліфікаваны для таго, каб вырашаць складаныя пытанні, якія прапаноўваюцца сучаснай навукай.

Аднак задачы комуністычнага будаўніцтва патрабуюць далейшага паляпшэння падрыхтоўкі навуковых кадраў і павышэння іх кваліфікацыі. Існуючы парадак падрыхтоўкі кадраў праз аспірантуру і дактарантуру не адпавядае патрабаванням далейшага развіцця навукі і задачам тэхнічнага прагрэсу. Слаба ўлічваюцца патрабаванні народнай гаспадаркі ў падрыхтоўцы спецыялістаў па фізіцы, біяхіміі, матэматыцы, электроніцы, паўправадніках і іншых новых галінах навукі. У той-жа час па раду гуманітарных навук падрыхтоўка аспірантаў перавышае патрабаванні ў гэтых кадрах. Кантынгенты аспірантаў раслі без уліку забяспечанасці іх кваліфікаваным кіраўніцтвам і эксперыментальнай базай.

Недахопы ў падрыхтоўцы і атэстацыі навуковых і педагагічных кадраў, выкрытыя Пастановай ЦК КПСС і Урадам, маюць месца, як адзначыў дакладчык, і ў рабоце Беларускага універсітэта. БДУ яшчэ недастаткова забяспечан кадрамі вышэйшай кваліфікацыі, поўнасцю адсутнічае прафесура на юрыдычным факультэце, аддзяленні геаграфіі, а таксама на цэлым радзе кафедр гуманітарных і прыродазнаўчых навук.

Мы ўсё яшчэ недастаткова займаемся вырашэннем праблем, якія маюць першаступеннае значэнне для народнай гаспадаркі.

Сур'ёзныя недахопы меліся пры абароне дысертацый у совеце гуманітарных навук і на асобных кафедрах, дзе некаторыя работы (Волк-Левановіч, Гурэвіч, Няхай, Пейсаховіч) не падвяргаліся глыбокаму крытычнаму разгледжанню. З 124 аспірантаў БДУ ў 61—кіраўнікамі былі толькі кандыдаты навук і некаторыя аспіранты (Палкін, Папова, Шэўчэнка) мелі грунтоўныя прэтэнзіі да кіраўніцтва.

У мэтах паляпшэння падрыхтоўкі і атэстацыі навуковых і педагагічных кадраў ЦК КПСС і Совет Міністраў СССР прынялі разгорнутую пастанову, устанаўліваючую новы парадак прыёма ў аспірантуру і адмену існуючага парадку падрыхтоўкі кадраў праз дактарантуру.

Устаноўлена, што кандыдацкія дысертацыі павінны ўтрымліваць новыя навуковыя вывады і рэкамендацыі, доктарскія работы—сур'ёзныя тэарэтычныя абагульненні і вырашэнні новых навуковых праблем, прадстаўляючых значны уклад у навуку і практыку. Прымаюцца да абароны толькі тыя кандыдацкія і доктарскія работы, якія папярэдне друкаваліся і абмяркоўваліся навуковай грамадскасцю.

Як падкрэсліў дакладчык і выступаўшыя ў спрэчках прафесары Н. А. Дарожкін, Н. Ф. Ермоленка, Т. Н. Годнеў, дацэнт М. І. Жыркевіч, кандыдат навук І. Я. Науменка і загадчык аспірантурай Н. П. Пратасевіч, прымаючы гэтую Пастанову Партыі і Урада да няўхільнага выканання, неабходна рэкамендаваць факультэцкім Вучоным советам і кафедрам абмеркаваць яе і намеціць практычныя мерапрыемствы, накіраваныя на рашучае паляпшэнне падрыхтоўкі і атэстацыі навуковых і педагагічных кадраў.

Вучоны совет пастанавіў адначасова з абмеркаваннем новых правілаў прыёму ў аспірантуру усім кафедрам універсітэта намеціць і ўнесці на разгляд рэктарата і Вучонага совета план публікацый, неабходных для павышэння кваліфікацыі кадраў. Вучоны совет універсітэта абавязаў советы факультэтаў павысіць патрабаванні да кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый.

Вучоны совет адзначыў усё узрастаючую ролю выдавецкай дзейнасці універсітэта, якая становіцца рашаючым этапам і ў атэстацыі навукова-педагагічных кадраў і ў заваяванні дзелавога аўтарытэта ў розных галінах навукі нашымі навуковымі работнікамі. Кафедрам, рэдакцыйным советам факультэтаў і выдавецтву БДУ трэба зрабіць усё для выдання сапраўды каштоўных работ вучоных універсітэта.

Выкананне Пастановы Партыі і Урада рашуча палепшыць падрыхтоўку і атэстацыю нашых навукова - педагагічных кадраў, падыме ўзровень усёй работы БДУ імя В. І. Леніна.



На здымку: сакратар камітэта комсамола Я. Бабосаў уручае студэнтцы 2 курса аддзялення матэматыкі Ніне Галубевай значок «За асваенне новых зямель».

## У НАШЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ

★ ★ ★

## У ГОНАР 7-ай ГАДАВІНЫ КІТАЙСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ

### Выстаўка, прысвечаная 75-годдзю з дня нараджэння Лу Сіня

Беларускае таварыства культурнай сувязі з заграніцай атрымала з Кітая матэрыялы аб жыцці і творчай дзейнасці Лу Сіня. На днях ва універсітэце па гэтых матэрыялах арганізавана фотавыстаўка на тэму: «Да 75-годдзя з дня нараджэння вялікага кітайскага пісьменніка Лу Сіня».

На ёй дэманструюцца фатаграфіі, якія адлюстроўваюць жыццёвы і творчы шлях пісьменніка. Вялікую цікавасць выклікаюць матэрыялы, звязаныя з асветніцкай дзейнасцю Лу Сіня.

Сувязі пісьменніка з перадавымі дзеячамі кітайскай і зарубежнай культуры адлюстроўваюць фатаграфіі Лу Сіня з Бернардам Шоу, Сун Цін Лінем і інш.

На выстаўцы маюцца здымкі перакладных работ рускіх і совецкіх пісьменнікаў, якія зроблены Лу Сінем, часопісаў, у якіх друкаваў свае творы пісьменнік. Прадстаўлен шэраг сямейных фатаграфій Лу Сіня.

Добра аформленая, змястоўная выстаўка выклікала вялікі інтарэс у студэнтаў універсітэта.

А. БЯЛОЎ.

## ЦІКАВЫ ВЕЧАР

3-га кастрычніка ва універсітэце адбыўся вечар, прысвечаны сёмай гадавіне Кітайскай народнай рэспублікі і 75-годдзю з дня нараджэння заснавальніка кітайскай літаратуры Лу Сіня.

З дакладам аб творчасці Лу Сіня выступіў загадчык кафедры зарубежнай літаратуры дацэнт Д. Е. Фактаровіч.

Затым быў паказан дакументальны кінофільм «Фестываль спартыўнай моладзі Кітая».

А. СІЛЯНКОЎ.



Добра папрацавалі сяброўкі Эля Шалаева і Аня Корсак (III курс філфака) на цалінных землях. →

Фото Э. Дамарацкага і М. Пільшчыкава.

## УСЕ СІЛЫ НА ЎПРЫГОЖАННЕ СТУДЭНЦКАГА ГАРАДКА

Дзве машыны, нагружаныя чарназёмам, астанаўліваюцца ва універсітэцкім двары. Юнакі і дзяўчаты, якія сядзяць наверсе, у кузаве, пачынаюць разгрузку. Чуюцца вясёлыя жарты, смех. Праходзіць некалькі мінут, і машыны ўжо разгружаны.

— Ну вось, застаўся ўсяго адзін рэйс,—гаворыць Г. Герасіменка.

Ён кіруе працай студэнтаў, якія засталіся ў гуртках мастацкай самадзейнасці. У вольны ад рэпетыцый час, яны праводзяць работы па добраўпарадкаванню універсітэцкага двара. Ужо выраўнена пляцоўка ля корпуса фізіка-матэматычнага факультэта. Цяпер сюды звозяць чарназём. Тут будуць пасаджаны маладыя дрэўцы і разбіты клумбы.

— Добра працуюць А. Дашкевіч, Н. Скроба і іншыя,—паведамляе Г. Герасіменка.—Але ёсць выпадкі, калі некаторыя студэнты ўхіляюцца ад сваіх абавязкаў. На вялікі жаль, гэтыя выпадкі вельмі частыя. Так, 27-га верасня не з'явіліся на працу студэнты-харысты Клебанаў, Калоша, Кошкіна, Руднік, Акінчыц, Усенка і іншыя—усяго 20 чалавек. 2-га кастрычніка з 12 удзельнікаў домра-балалаечнага аркестра, выдзеленых на работу, не прыйшло 5 чалавек. І гэта ў той час, калі іх таварышы напружана працуюць на калгасных палях. Гэта ганебны факт, з якім нельга мірыцца.

О. ЯНОЎСКІ.

## ВАЖНАЯ ПАДЗЕЯ Ў ЖЫЦЦІ УНІВЕРСІТЭТА

У другой палавіне кастрычніка гэтага года адбудзецца другая навукова-метадычная канферэнцыя Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Канферэнцыя узбагаціць вопыт навукова-метадычнай работы кафедр БДУ і абмяркуе метады, якія павінны садзейнічаць удасканаленню падрыхтоўкі кадраў.

Праграма канферэнцыі уключае ў сябе абмеркаванне чатырох дакладаў на пленарных пасяджэннях і 80 дакладаў у 13 секцыях.

На пленарных пасяджэннях ставяцца даклады—«Марксісцка-ленінская тэорыя пазнання—метадалагічная аснова працэса навучання» (дацэнт В. І. Сцяпанаў), «Формы і метады арганізацыі самастойнай работы студэнтаў» (прафесар В. Н. Перцаў), «Кінофікацыя вучэбнага працэсу» (дацэнт Л. С. Абецэдарскі), «Формы і метады палітыка-выхаваўчай работы ў ВНУ» (дацэнт Л. В. Шашкоў).

У секцыі грамадскіх навук значнае месца займаюць даклады па методыцы семінарскіх заняткаў і арганізацыі самастойнай работы па эканамічных дысцыплінах.

Гістарычны факультэт абмяркуе даклады, прысвечаныя методыцы кіраўніцтва дыпломнымі і курсавымі работамі па гісторыі, а таксама методыцы чытання лекцый і правядзення практычных заняткаў па гісторыі на завочным факультэце.

Філалагічная секцыя заслухае даклады аб змесце і методыцы правядзення лекцый у ВНУ па лінгвістычных і гісторыка-філалагічных дысцыплінах, па розных відах самастойных работ, методыцы выкладання беларускай і рускай моў ва універсітэце і сярэдняй школе, аб правядзенні педагагічнай практыкі, пастаноўцы курса лекцый і практычных заняткаў па літаратуразнаўству і вопыту правядзення калёквіумаў па гісторыі зарубежных літаратур.

Матэматычная секцыя ставіць на сваіх пасяджэннях два даклады: «Выкладанне асноў геаметрыі» і «Методыка арганізацыі кіраўніцтва курсавымі і дыпломнымі работамі».

Секцыя фізічная абмяркуе даклады, прысвечаныя рабоце студэнтаў над лекцыямі і іх удзелу ў навукова-даследчай рабоце, методыцы правядзення спецсемінара па фізічнай оптыцы, выкладанню фізікі на нефізічных факультэтах універсітэта, аб палітэхнічнай падрыхтоўцы студэнтаў у працэсе выкладання фізічных дысцыплін.

Методыцы правядзення практыкі па геадэзіі і палітэхнічнай падрыхтоўцы студэнтаў у працэсе выкладання геаграфічных дысцыплін і правядзенню праддыпломнай практыкі прысвечаны даклады географаў. Метадычным пытанням арганізацыі самастойнай работы геолагаў і зместу вучэбнай практыкі прысвячаюцца даклады геаграфічнай секцыі.

Хімічная секцыя ставіць даклады па праблеме нагляднасці ў вышэйшай школе, аб змесце, арганізацыі і правядзенні вытворчай практыкі студэнтаў, аб палітэхнічнай падрыхтоўцы студэнтаў у працэсе выкладання хімічных дысцыплін.

Біялагічная секцыя абмяркуе даклады аб правядзенні лабараторных заняткаў па фізіялогіі раслін, аб задачах і методыцы выкладання дарвінізма ва універсітэце і ў сярэдняй школе, аб пастаноўцы вялікага спецпрактыкума па заалогіі, аб навуковым малюнку і яго ролі ў падрыхтоўцы спецыялістаў-біёлагаў і, нарэшце, аб розных баках палітэхнічнай падрыхтоўкі студэнтаў-біёлагаў.

Шэраг дакладаў, прысвечаных методыцы выкладання замежных моў і методыцы фізічнага выхавання і спорту, ставяцца на абмеркаванне спецыяльных секцый.

Юрыдычная секцыя абмяркуе даклады: «Методыка правядзення спецсемінараў па тэорыі дзяржавы і права» і «Методыка правядзення практычных заняткаў па калгаснаму праву».

У ходзе падрыхтоўкі да канферэнцыі асобныя кафедры спазняюцца з прадстаўленнем тэзісаў сваіх дакладаў (кафедры гістарычнага факультэта, некаторыя кафедры біялагічнага факультэта). Між тым, тэзісы дакладаў здаюцца ў друк і павінны быць своечасова разгледжаны на пасяджэннях кафедр.

Актыўны удзел у падрыхтоўчай рабоце да навукова-метадычнай канферэнцыі прымаюць дацэнты В. І. Сцяпанаў, М. І. Жыркевіч, Н. Г. Раманоўскі, А. Х. Шкляр, В. А. Дарогін.

Справа гонару работнікаў універсітэта—правесці другую навукова-метадычную канферэнцыю на высокім узроўні.

Яны працавалі на цалінных землях

# НАША РАБОТА БЫЛА КАРЫСНАЙ

Калі мы ад'язджалі у Казахстан, я нават не думала, што мне прыдзецца працаваць поварам. Не думала, але давялося. 31 ліпеня мы прыбылі у брыгаду, і хутка я прыступіла да працы. Дома даводзілася гатаваць на 5 чалавек, а у брыгадзе—на 70.

У нашай брыгадзе не было калодзежа, і бензавоз падвозіу нам прадукты за сем кіламетрау, з цэнтральнай сядзібы. Своечасова не прывязуць ваду—не зможаш у тэрмін зварыць абед або вячэру. Прадукты у нас развозілі па брыгадах кожны дзень, асабліва у час уборачнай. Нам дастаулялі мяса, рыс, вермішэль, гародніну, яблыкі, масла, каубасу, белы хлеб. Але часам аўталаўка, замест таго, каб прыехаць у 12 гадзін дня, прыязджала у 8 гадзін вечара. Даводзілася самой хадзіць некалькі разоу за прадуктамі. Назад вярталася на папутных машынах.

Асабліва многа давялося папрацаваць у перыяд уборачнай. На дапамогу прыйшла Ніна Голубева. Спалі мала. Падніmaліся у 3 гадзіны ночы, каб да 6 гадзін згатаваць снеданне, бо у гэты час камбайны выходзілі у поле.

Не паспелі паснедаць, як ужо трэба ставіць абед. Да часу ён павінен быць гатовым. Часта не было дроу. Тады даводзілася ламаць скрынкі, доскі, збіраць планкі ля камбайнау.

Нарэшце, абед гатовы. Мы з Нінай павінны даставіць яго у поле да 13 камбайнау, якія працуюць у двух-трох месцах, размешчаных адно ад другога не блізка. Спецыяльнай машыны у нас не было. Калі возьме папутная—добра. Вельмі часта нас выратоувалі мясцовыя шафёры. Але нярэдка даводзілася разносіць абед самім.



Па торбе за плечы, чай і другое у адну руку, бідон з першым—у другую—і пайшлі пешшу у поле. А там камбайны не чакаюць. Бывала, так стомішся, што ахвота усё кінуць, сесці і пра усё забыць. Але падумаеш, што людзі галодныя, і ідзеш далей.

Прыдзеш да камбайна і адразу забудзеш пра стому, убачыўшы, як радасна сустракаюць людзі. Рассцелеш абрус, паставіш салянку, накладзеш хлеб, ужо загадзя нарэзаны—і запрошваеш да стала. За абедам заусёды жарты, смех.

Да другога камбайна падкінуць на трактары. За гадзіну, вядома, не разнясеш да усіх 13 камбайнау. Да апошняга падыходзіш ужо у гадзіны 4. Але за гэта камбайнёры не скардзіліся ні разу. Падакараюць, пасмяюцца трохі, ды і дзякуй скажуць.

А вось вячэру разносіць куды горш. Выйдзеш, калі светла, а пакуль разносіш—ноч у поле застане. Навокал агні, куды ісці—не ведаеш. Бывала і так, што гледзячы на агні, пападзеш не у сваю брыгаду. Пасмяюцца камбайнёры, што іх сёмая брыгада харчаваннем забяспечвае, і падвязуць на наша поле. Людзі у соугасе вельмі добрыя і чулыя.

Дамоу вяртаемся часам у гадзіну ночы, парадкам паблукаушы на полі.

У апошнія дні перад ад'ездам ішлі дажджы, працаваць станавілася усё цяжэй, але ніколі у нас не узнікала думка: «Навошта паехалі?»

Усе мы засталіся вельмі задаволенымі паездкай. За гэты час мы многае убачылі, аб многім даведаліся.

Добрую памяць аб сабе пакінулі у соугасе Валодзя Крысевіч, Надзя Бурауцова, Ніна Голубева, Ала Харытановіч, Валодзя Важнікау і іншыя.

**Д. ШЧЭРБІНСКАЯ,**
**студэнтка 2 курса аддзялення матэматыкі.**

*ПА СТАРОНКАХ НАСЦЕННЫХ ГАЗЕТ*

# БОЛЬШ ТАКІХ ЦІКАВЫХ НУМАРОЎ

Празвінеу званок. І адразу-ж з розных аудыторый фізмата студэнты накіраваліся да насцен-газеты.

— Добрым атрымауся нумар,—чуюцца галасы тых, хто паспеу прачытаць газету.

Асаблівую цікавасць выклікала яна у першакурснікау, якія нядауна прыехалі з калгасных палёу, дзе працавалі 15 дзён. Такіх вялікіх, добра афармленых газет ім не даводзілася бачыць у школе.

Прыемнае уражанне застаецца ва усіх пасля азнаямлення з першым у гэтым навучальным годзе нумарам насценнай газеты «За навуку», які выйшау 26 верасня.

Чым-жа цікавы гэты нумар? Больш за усё—змястоунымі, добра апрацаванымі матэрыяламі, узятымі з жыцця факультэта, састауленымі, як гавораць журналісты, з мясцовых фактау.

У перадавым артыкуле «З першых дзён вучобы за сур'ёзную работу» дэкан факультэта М. П. Халімановіч гаворыць аб тым, што працаваць патрэбна рэгулярна, а не ад сесіі да сесіі.

Цеплынёй і шчырасцю прасякнуты артыкул «Словы да першакурснікау». Аутары яго—студэнты 4-га курса—даюць парады сваім малодшым сябрам, перасцерагаюць іх ад памылак, якія былі дапушчаны студэнтамі у мінулыя гады.

Першакурснік аддзялення матэматыкі У. Манастырскі у сваёй заметцы заклікае сяброу-аднакурснікау апраудаць давер'е Радзімы, быць дастойнымі высокага звання совецкіх студэнтау.

Аб добрай працы першакурснікау на калгасных палях гаворыцца у заметцы «Удзячнасць брыгадзіра».

Старшы лабарант І. В. Галаваты паведамляе, што студэнты, якія працавалі у 3 брыгадзе, заслужылі вялікую павагу у калгаснікау. Корнеу, Савельеу, Юркоуская—лепшыя з іх.

Безумоуна, матэрыял з аднаго калгаса не дае яулення аб працы студэнтау усяго факультэта. Было-б значна лепш, каб газета асвятліла працу студэнтау у двох-трох калгасах.

Не засталася без увагі газеты практыка пяцікурснікау на радыёзаводзе. Ёй прысвечаны артыкул студэнтау 5-га курса А. Аусіевіч, С. Буцько і Г. Нячай. Тут-жа фатаграфіі Л. Паляніна «У цаху зборкі тэлевізарау» і «У цэнтральнай лабараторыі».

Аб задачах грамадскіх арганізацый факультэта гаворыць сакратар факультэцкага партбюро І. П. Зяцькоу.

У газеце можна прачытаць і аб новым парадку назначэння стыпендый студэнтам, і аб студэнцкім Святе песні у Тарту, і аб недакладнасці распісання.

Не толькі змест гэтага нумару выклікае цікавасць да яго. Газета вельмі добра афармлена: тут добрыя фатаграфіі, прыгожа намалёваныя загалоукі.

Трэба адзначыць, што рэдкалегія насценгазеты «За навуку» добрасумленна папрацавала над падрыхтоукай першага нумару, змагла прыцягнуць да выпуску газеты шырокі актыу, проста і цікава асвятліць жыццё факультэта.

Адначасова з газетай выйшау сатырычны лісток «Пылесос»—прылажэнне да насценгазеты. Вострыя карыкатуры прыцягваюць да яго таксама агульную увагу.

Хочацца пажадаць рэдкалегіі газеты «За навуку» і надалей выпускаць такія-ж цікавыя, змястоуныя нумары газет.

**О. СЦЕПАНЕНКА.**

# НЕДАХОПАЎ У ГАЗЕЦЕ НЕ ПАВІННА БЫЦЬ

Выйшлі першыя нумары насценных газет на біёлага-глебавым і геаграфічным факультэтах. Яны знаёмяць студэнтаў з планамі факультэтаў у новым навучальным годзе, тут змешчаны матэрыялы, якія расказваюць аб практыцы і летнім адпачынку студэнтаў, заметкі першакурснікаў.

Па тэматыцы змешчаных матэрыялаў характар гэтых газет амаль аднолькавы, але па форме падачы іх, афармленню—яны значна адрозніваюцца.

Першы нумар газеты «За мичуринскую биологию», выпуск якой датыруецца 10 верасня,—змястоуны, добра афармлены. Газета адкрываецца артыкулам дэкана біёлага-глебавага факультэта П. Г. Пятровіча. У артыкуле гаворыцца аб пастаноўцы вучэбна-выхаваўчай і навуковай работы ў новым навучальным годзе ў святле указанняў Міністэрства вышэйшай адукацыі, узнімаюцца пытанні падрыхтоўкі спецыялістаў высокай кваліфікацыі, якія змогуць ажыццяўляць палітэхнізацыю навучання ў сярэдняй школе. Аўтар указвае на неабходнасць больш цеснай сувязі работнікаў і студэнтаў факультэта з сельскай гаспадаркай, павышэння якасці чытаемых лекцый, патрабаванняў, прад'яўляемых да студэнтаў пры адказах на заліках і экзаменах.

У газеце змешчана цікавая падборка «Наша лета». У ёй студэнты расказваюць аб сваім летнім адпачынку, незабыўнай паездцы у Тарту на Свята песні, аб экспедыцыі па азёрах Беларусі, аб практыцы, якую праводзілі студэнты біяфака на возеры Нарач, у Белавежскай пушчы, Запаляр'і, у Крыме і на Каўказе.

Але трэба адзначыць, што ў газеце дапускаюцца граматычныя памылкі.

Інакш выглядзіць газета геолага-геаграфічнага факультэта «Исследователь». Яна нават без нумару і час выхаду яе невядомы. Толькі прачытаўшы яе матэрыялы, можна здагадацца, што выпушчана яна ў новым навучальным годзе.

Тут змешчана пісьмо групы студэнтаў, якія працавалі на уборцы ураджаю на цалінных землях. Рэдкалегія не паклапацілася адрэдагаваць яго, у выніку дапушчана шмат памылак. Заметка студэнтаў першага курса Шыц, Малаглавец і Івановай азаглаўлена «Нашы уражанні». У ёй студэнты расказваюць аб сваіх планах на будучае і ні слова не гавораць аб сваіх уражаннях. Чаму-ж заметка атрымала такі загаловак—невядома.

Рэдкалегіі насценнай газеты «Исследователь» трэба змяшчаць больш цікавыя матэрыялы аб жыцці студэнтаў факультэта, падаваць іх у жывой форме, лепш афармляць газету.

Трэба зрабіць сур'ёзны папрок у адрасы рэдкалегій насценных газет факультэтаў, якія да гэтага часу не выпусцілі ніводнага нумару газеты.

**В. ЧЭПІКАЎ.**

# ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ

* * *

## Новая сістэма фізічнага выхавання студэнтаў

Наш карэспандэнт звярнууся да загадчыка кафедры фізічнага выхавання і спорту Я. Р. Маркава з просьбай расказаць аб тым, як кафедра мяркуе пабудаваць спартыуную работу у новым навучальным годзе.

Ніжэй мы друкуем змест гутаркі.

— Ужо з другога поугоддзя 1955/56 навучальнага года на першым і другім курсах былі уведзены дадатковыя факультэцкія заняткі па фізічнаму выхаванню студэнтау. Гэта дало магчымасць кожнаму студэнту займацца чатыры гадзіны у тыдзень па выбранаму віду спорту.

За аснову спартыунай спецыялізацыі узяты тры віды спорту: лёгкая атлетыка, гімнастыка і лыжы. Секцыі-ж па гэтых відах спорту на працягу многіх год былі самымі шматлікімі.

Студэнты, якія праяуляюць схільнасць да іншых відау спорту, які, напрыклад, акрабатыкі, валейболу, баскетболу, штангі, фехтавання і г. д., будуць аб'яднаны у спецыяльныя вучэбныя групы. Заняткі у іх будуць праводзіцца у вячэрні час. Гэта выклікана тым, што заняткі ва універсітэце праводзяцца у дзве змены.

Студэнты, якія маюць высокія спартыуныя дасягненні, будуць займацца на спецыяльным курсе спартыунага удасканалення.

Пераход на новую праграму фізічнага выхавання студэнтау абмеркавауся на пасяджэнні рэктарата. Былі намечаны мерапрыемствы, накіраваныя на паляпшэнне спартыўна-масавай работы сярод студэнтау.

Ва універсітэце абсталяваны пакой пад душ, у спартыунай зале ўстаноўлены вентылятары. Прыведзена у парадак спартыуная база. Закуплены інвентар на 50 тыс. рублёў, на баскетбольнай пляцоўцы устаноўлены пражэктары. Гэта дасць магчымасць праводзіць трэніроўкі валейбалістау і баскетбалістау да наступлення халадоу на паветры.

У заключэнне тав. Маркау сказау, што кафедра фізічнага выхавання і спорту сумесна з Советам калектыву фізкультуры і камітэтам ЛКСМБ універсітэта зробіць усё неабходнае, каб прыцягнуць максімум студэнтау да сістэматычных заняткау фізкультурай і спортам.

## План спартыўна-масавых мерапрыемстваў на першы семестр

Прарэктар па вучэбнай рабоце універсітэта А. Я. Малышау зацвердзіу план спартыуна-масавых мерапрыемствау на першы семестр 1956/57 навучальнага года.

У кастрычніку зборныя каманды БДУ па валейболу і баскетболу прымуць удзел у спаборніцтвах ВНУ на першынство абласнога совета ДСТ «Буравеснік».

З 15 па 25 кастрычніка студэнты другіх курсау будуць здаваць нарматывы комплекса ГПА другой ступені.

4-га лістапада адбудзецца традыцыйная камбініраваная эстафета паміж зборнымі камандамі лёгкаатлетау і лыжнікаў. Тыднем пазней пачнуцца спаборніцтвы на каманднае першынство універсітэта па шахматах і шашках. А з 20 лістапада пачнуцца спаборніцтвы валейбалістаў. Розыгрыш кубка прафкома па баскетболу будзе праведзен у канцы месяца.

Многа цікавага чакае аматарау спорту у снежні. У першых чыслах гэтага месяца адбудуцца спаборніцтвы на першынство універсітэта па стральбе і удзел у першынстве абласнога совета ДСТ «Буравеснік» па гімнастыцы. З 9-га снежня пачнуцца таварыскія спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы паміж зборнымі камандамі універсітэта, політэхнічнага і лесатэхнічнага інстытутау.

У сярэдзіне месяца адбудуцца класіфікацыйныя спаборніцтвы па фехтаванню, штанзе, плаванню. А ў апошніх чыслах—лыжнікі выйдуць на старт адкрыцця зімовага сезону.

## Дыск ляціць за 40 метраў

Тры дні працягваліся спаборніцтвы на асабістае першынство горада Мінска па лёгкай атлетыцы. У іх прынялі ўдзел і мацнейшыя лёгкаатлеты універсітэта. Некаторыя з іх дабіліся выдатных вынікаў.

Два гады кідае дыск Вячэслау Чэмярыцкі. Але ні адзін яго вынік не быу такім бліскучым, як на гэтых спаборніцтвах. Дыск, пасланы рукой студэнта, апусціуся за адзнакай 40,44 м. Гэта вынік вышэй за нарматыў другога разраду і новы рэкорд універсітэта.

За ўзровень трэцяга разраду падняу рэкорд універсітэта Уладзімір Сітнікау. Ён кінуу кап'ё на 47,71 м. Два добрыя вынікі паказала студэнтка гістарычнага факультэта майстар спорту Яўгенія Гурвіч. Яна першынствавала па прыжках у вышыню (150 см) і даужыню (5 м 59 см.). Першы вынік—новы рэкорд БДУ. А рэзультат па прыжках у даўжыню з разбегу значна вышэй нарматыву першага разраду.

Другое месца заняу Уладзімір Гараеу па прыжках у даўжыню—6,74 м. Ўсяго два сантыметры прайграў яму Леанід Станішэускі. Яшчэ адзін раз падняуся на п'едэстал гонару першакурснік Уладзімір Гараеу. Ён заняў другое месца па трайному прыжку—14,31 м.

**Н. НІКАЛАЕЎ.**

## ПОСПЕХ Р. БЕЛЯКОВАЙ

Днямі закончыліся спаборніцтвы па фехтаванню на першынство Беларускага рэспубліканскага Совета ДСТ «Буравеснік».

У гэтых спаборніцтвах прыняла ўдзел студэнтка III курса хімічнага факультэта Рыма Белякова, Сярод рапірыстак здольная спартсменка БДУ, якая выступала летам гэтага года на Спартакіядзе народаў СССР, аказалася мацнейшай. Яна стала чэмпіёнкай у гэтым відзе зброі.

Праз некалькі дзён Рыма паедзе у Маскву на Усесаюзнае першынство ДСТ «Буравеснік».

Рэдакцыя газеты „БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ"
ПАВЕДАМЛЯЕ, што АБ'ЯЎЛЕНЫ
у мінулым навучальным годзе **КОНКУРС**
на лепшы фельетон, нарыс працягваецца
да 1 студзеня 1957 года.
Таварышы студэнты, аспіранты, выкладчыкі
і супрацоўнікі БДУ, прымайце ўдзел у конкурсе!

Адрас рэдакцыі: Мінск. Універсітэцкі гарадок, Біякорпус, пакой 62, тэл. 2-07-19 Рэдактар А. ВОЛК.

АТ 07560 Друкарня выдавецтва БДУ. Зак. 1111 Тыраж 2000